**Тэарэтычныя асновы вывучэння прыметніка**
**на ўроках беларускай мовы**
**ў сярэдняй школе**

## 1. Мэты і задачы вывучэння прыметніка на ўроках беларускай мовы

У працэсе вывучэння беларускай мовы вучні павінны засвоіць яе гукавую сістэму (фанетыку), лексіку і граматыку, а таксама ўмовы яе фарміравання і спецыфіку функцыянавання ў вусным і пісьмовым маўленні. У аспекце даследавання ўмоў засваення школьнікамі граматыкі вядзецца гаворка пра марфалагічныя і сінтаксічныя катэгорыі і асаблівасці.

Школьны курс марфалогіі дапамагае вучням практычна авалодаць навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, выразнага чытання, арфаграфічнымі, пунктуацыйнымі, стылістычнымі ўменнямі.

Прыметніку адводзіцца істотная роля ў школьным курсе беларускай мовы. Знаёмства з яго важнейшымі граматычнымі формамі і катэгорыямі (напрыклад, ліку, роду, склону) павінна паўплываць на маўленчую практыку школьнікаў, паколькі граматычныя з’явы характарызуюцца багаццем і разнастайнасцю формаў, лексіка-семантычных і стылістычных магчымасцей. У сувязі з гэтым пры вывучэнні прыметніка вырашаецца найважнейшая метадычная задача фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў, г.зн. авалодання моўнымі сродкамі з пункту гледжання іх прызначэння, выкарыстання ў разнастайных відах маўленчай дзейнасці.

Вывучэнне прыметніка садзейнічае і кагнітыўнаму развіццю асобы. Такія разумовыя паняцці, як сінтэз, аналіз, параўнанне, абагульненне, індукцыя і інш., з’яўляюцца асноўнымі прыёмамі пры авалоданні граматычнымі прыметамі прыметнікаў, размежаванні родавых і відавых паняццяў, вызначэнні сэнсава-граматычнай ролі прыметнікаў ў тэксце.

Вывучэнне прыметніка, у прыватнасці, праца над семантыкай маўленчых адзінак, стварае вялікія магчымасці і для інтэнсіўнага разумовага развіцця вучняў.

Асноўныя *адукацыйныя мэты* вывучэння прыметніка:

- садзейнічаць выпрацоўцы ў вучняў ведаў пра прыметнік як дакладна арганізаваную сістэму;
- пазнаёміць вучняў з і граматычнымі катэгорыямі прыметнікаў;
- сфарміраваць уяўленне пра тэкстаўтваральную ролю прыметніка.

*Практычныя мэты* вывучэння прыметніка:

- дапамагчы школьнікам засвоіць формы словазмянення і навучыць правільна ўжываць гэтыя формы пры пабудове словазлучэнняў і сказаў; удасканальваць граматычны лад мовы, культуру вуснага і пісьмовага маўлення вучняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- спрыяць засваенню пэўных звестак аб слова- і формаўтварэнні прыметнікаў;
- выпрацоўваць неабходныя арфаграфічныя і пунктуацыйныя навыкі.

*Развіццёвыя мэты* звязаны найперш з удасканаленнем лінгвістычнага мыслення, граматычнага ладу, маўлення школьнікаў.

У час вывучэння прыметніка школьнікі вырашаюць наступныя задачы:

- знаёмяцца ў апісальнай форме з граматычным ладам прыметніка;
- засвойваюць (тэарэтычна і практычна) найважнейшыя граматычныя правілы пра змяненне прыметнікаў, спалучэнне іх у словазлучэнні і сказы і ўжыванне ў тэкстах;
- прыводзяць у сістэму і асэнсоўваюць з граматычнага пункту гледжання вядомыя ім з папярэдняга маўленчага і вучэбнага вопыту шматлікія і разрозненыя факты мовы;
- практыкуюцца ў прымяненні вывучаных граматычных правілаў і звестак у вусным і пісьмовым маўленні і ў час засваення арфаграфічных і пунктуацыйных правілаў.

Такім чынам вывучэнне прыметніка ў школе вырашае шматлікія метадычныя, адукацыйныя, практычныя і развіццёвыя мэты, а таксама пэўныя задачы.

## 2. Прынцыпы вывучэння прыметніка на ўроках беларускай мовы

Як ужо адзначалася, школьны курс марфалогіі дапамагае вучням практычна авалодаць навыкамі пісьмовага і вуснага маўлення, выразнага чытання, арфаграфічнымі, пунктуацыйнымі і стылістычнымі ўменнямі.

У час засваення вучнямі сістэмы часцін мовы (а менавіта іх вывучае марфалогія), у тым ліку і прыметніка, настаўнік павінен кіравацца асноўнымі тэарэтычнымі палажэннямі, якія дазволяць правільна выбраць змест, метады, прыёмы, сродкі і формы навучання і называюцца **прынцыпамі**.

Дыдактыка выпрацавала прынцыпы, агульныя для ўсіх школьных прадметаў: *навуковасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, свядомасці і актыўнасці, трываласці, даступнасці, нагляднасці, пераемнасці і перспектыўнасці, сувязі тэорыі з практыкай, індывідуальнага падыходу, адзінства навучання, выхавання і развіцця* і інш. Выдзяляюцца таксама *прынцып жанрава-стылістычнай арыентацыі, прынцып цэласнасці і ўзаемаабумоўленасці развіцця мовы і мыслення вучняў, прынцып актыўнай камунікацыі, прынцып сувязі работы па развіцці мовы і мыслення з вывучэннем усіх раздзелаў школьнага курса роднай мовы і літаратуры, прынцып узаемасувязі пры развіцці вуснай і пісьмовай мовы.* Акрамя гэтых,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вылучаюцца і іншыя, параўнальна новыя, прынцыпы навучання. Сярод іх – наступныя.

*Прынцып антрапалізацыі адукацыі* заключаецца ў развіцці базавых для чалавека інтэлектуальных і маўленчых здольнасцей, закладзеных у дзіцяці прыродай, іх удасканаленні ў працэсе сацыяльнай практыкі.

*Прынцып успрымання вучэбнага матэрыялу з пазіцый асобасных патрэб* прадугледжвае вывучэнне мовы не толькі як знакавай сістэмы, але і як сродку пазнання свету, матэрялізацыі думкі і інш.

*Прынцып развіццёвага навучання* грунтуецца на тым, што вучэбная дзейнасць скіравана не на засваенне гатовых ведаў, а на ўменне іх здабываць.

*Прынцып педагагічнай кангеніяльнасці і свабоды ў развіцці асобы* прадугледжвае, што сумесная дзейнасць вучня і настаўніка як раўнапраўных суб'ектаў ажыццяўляецца ў атмасферы камунікатыўна-кагнітыўнага, крэатыўнага асяроддзя, дзе ёсць права выбару, пошуку, дыскусій.

Вывучэнне прыметніка (як і іншых часцін мовы) ў камунікатыўна-дзейнасным аспекце патрабуе захавання *прынцыпу стымулявання і арганізацыі выкарыстання граматычных ведаў у маўленчай практыцы*, які мае на ўвазе вывучэнне часцін мовы на аснове іх функцыянавання ў маўленні, у працэсе асэнсавання марфалагічнай адзінкі як сродку маўленчай выразнасці. Пры гэтым стымулюючы аспект звязваецца з улікам індывідуальных інтарэсаў вучняў і матываў навучання; з прызнаннем за асноўныя адзінкі навучання маўленчых дзеянняў, сітуацый і тэкстаў, а арганізацыйная дзейнасць настаўніка спрыяе маўленчай актыўнасці навучэнцаў на кожным уроку.

Улічваецца і *прынцып творчай імітацыі*, на аснове якога ажыццяўляецца перанос ведаў і ўменняў з тэксту-ўзору на мадэлюемае выказванне; адэкватны адбор моўных сродкаў з улікам камунікатыўнай сітуацыі; засваенне моўных і маўленчых нормаў, асэнсаванне паказчыкаў добрага маўлення; авалоданне тэхнікай маўленчай дзейнасці.

Важнае значэнне мае і *прынцып камунікатыўнай мэтазгоднасці і перспектыўнасці*, які рэгламентуе вывучэнне марфалагічных адзінак на аснове аналізу іх маўленчага функцыянальнага патэнцыялу ў напрамку "моўны сродак ==== функцыя (як патэнцыял) ===== канчатковы прадукт маўленчай дзейнасці (як рэалізаваны патэнцыял)".

Адным з прынцыпаў вывучэння прыметніка з'яўляецца *прынцып уліку тэкстаўтваральнай ролі розных часцін мовы* (сэнсава-граматычная роля часцін мовы). На ўроках марфалогіі неабходна паслядоўна растлумачыць асноўныя тэкстаўтваральныя функцыі самастойных і службовых часцін мовы, адначасова навучыць дзяцей выкарыстоўваць вывучаныя моўныя адзінкі для рэалізацыі такіх асноўных паказчыкаў тэксту, як звязнасць, завершанасць, цэласнасць. З гэтай мэтай вучням трэба паказаць, якія функцыі ў стварэнні тэксту (апавядання, апісання, разважання) выконвае кожная часціна мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэкстаўтваральная роля прыметнікаў залежыць ад іх пазіцыі ў сказе. Прыметнік з'яўляецца рэматычнай дамінантай тэкстаў-апісанняў рэпрадуктыўнага і інфарматыўнага характару. Напрыклад :

Гэлька **была прыгожая** дзяўчынка. Прыгожая той прыгажосцю, якая адразу кадалася ў вочы і не магла нікога пакінуць раўнадушным. **Невысокая** ростам, **мініяцюрная, нібы вытанчаная, смуглатварая,** з **чорнымі, кучаравымі**наж ілбом завіткамі валасоў і дзёрзкімі **блакітнымі** вачыма – **быстрымі** і **ўсмешлівымі.** I ўся яна сама **была шустрая** і **жывая**, як ртуць. Усе і заўсёды ў Ліпніцы звалі яе ласкава - Гэлька

(А. Кудравец)

Прыметнікі ў атрыбутыўнай пазіцыі маюць падпарадкавальную функцыю, называюць разнастайныя прыметы (эмацыяльныя, ацэначныя, інфармацыйныя і інш.) прадмета маўлення ў тэкстах розных стыляў і жанраў.

Такім чынам, пры вывучэнні прыметніка настаўнік павінен ведаць і кіравацца разнастайнымі пранцыпамі, як дыдактычнымі, так і прынцыпамі, звязанымі з праблемным навучаннем.

## 3. Метады і прыёмы вывучэння прыметніка на ўроках беларускай мовы

Метадамі навучання называюццца спосабы сумеснай мэтанакіраванай дзейнасці настаўніка і вучняў па авалоданні школьнікамі ведамі і практычнымі ўменнямі. Пры выбары метадаў вывучэння назоўніка ў сярэдняй школе неабходна ўлічваць многія фактары, у прыватнасці:

- складанасць матэрыялу, які выносіцца на вывучэнне;
- ступень навізны матэрыялу;
- падрахтаванасць канкрэтнага класа да засваення матэрыялу.

Дыдакты і метадысты прапануюць розную класіфікацыю метадаў навучання. Паводле крыніцы перадачы і ўспрымання вучэбнай інфармацыі (гл., напрыклад: 4, с.145-159) метады падзяляюцца на: слоўныя (паведамленне, гутарка, лекцыя), наглядныя (ілюстрацыі, назіранні, экскурсіі), практычныя (практыкаванні аналітычнага і сінтэтычнага характару), лмнгвістычны эксперымент і інш. Па логіцы перадачы і ўспрымання інфармацыі метады бываюць індуктыўныя і дэдуктыўныя. Па ступені самастойнасці мыслення вучняў пры аваладанні ведамі адрозніваюць метады рэпрадуктыўныя і праблемна-пошукавыя. У асобную групу вылучаюцца метады кантролю за вучэбнай дзейнасцю школьнікаў: вуснага кантролю (франтальнае і індывідуальнае апытванне, вусны залік), пісьмовага кантролю (кантрольная праца, дыктант, пераказ, сачыненне, пісьмовы залік), камп'ютарнага кантролю і інш.

Першы метад, які можа быць выкарыстаны пры вывучэнні прыметніка, - *паведамленне настаўніка*. Карыстаючыся гэтым метадам, настаўнік сам выкладае вучэбны матэрыял ў пэўнай сістэме і дакладна вызначанай паслядоўнасці, адказвае на пытанні вучняў, тлумачыць незразумелыя факты, паведамляе звесткі, якіх няма ў падручніку. Пры ім настаўнік спачатку засяроджвае ўвагу вучняў на галоўных пытаннях тэмы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

потым тлумачыць больш дэталёва і грунтоўна, ілюструе прыкладамі. Аднак гэта не суцэльны маналог. Пры гэтым метадзе можна выкарыстоўваць прыём прадметных дзеянняў, выдзяленне апорных лінгвістычных фактаў, паўторнае тлумачэнне ў іншым моўным стылі, параўнанне лінгвістычных фактаў і інш. Паведамленне настаўніка іожа быць працяглым (10-15 хвілін) і кароткім (3-5 хвілін).

Паведамленне настаўніка мэтазгодна выкарыстаць пры абагульненні, паўтарэнні і сістэматызацыі ведаў па тэме "Прыметнік".

Наступны мэтад, які можа быць выкарыстаны пры вывучэнні згаданай тэмы, - *гутарка.* Гэты метад навучання заснаваны на дыялогу паміж настаўнікам і вучнем. Гутаркі бываюць наступных тыпаў:

- падрыхтоўчая (узнаўленне па пытаннях настаўніка раней вывучанага для стварэння апоры пры засваенні новага);
- эўрыстычная (настаўнік з дапамогай пытанняў падводзіць вучняў да ўсведамлення новага);
- узнаўляльная (дыялог паміж настаўнікам і школьнікам пры замацаванні вывучанага з мэтай абгрунтавання вучэбных дзеянняў);
- паўтаральна-абагульняльная (выкарыстоўваецца пры паўтарэнні вывучанага ў папярэднім класе, абагульненні матэрыялу ў канцы ўрока або тэмы "Прыметнік").

Надзвычай стымулюе пазнавальную дзейнасць вучняў *эўрыстычная гутарка*. Сутнасць гэтага метаду заключаецца ў пастаноўцы настаўнікам спецыяльна падабраных пытанняў, якія падвядуць вучняў да самастойнага адкрыцця новага. Ён найбольш эфектыўны пры тлумачэнні новага матэрыялу. Так, М.Г.Яленскі (4 у спісе выкарыстанай літаратуры) рэкамендуе яе праводзіць па тэме "Правапіс суфіксаў назоўнікаў".

*Метад працы з падручнікам* - неад'емная частка амаль кожнага ўрока беларускай мовы, выкарыстанне якога абумоўлена не толькі мэтай замацавання ведаў (напрыклад, чытанне тэарэтычнай часткі), але і атрымання іх смастойна. Якраз апошняе патрабуе падрыхтоўкі вучняў да працы з падручнікам (неабходна навучыць выдзяляць асноўныыя палажэнні, складаць план, рыхтаваць пераказ зместу параграфа і інш.), і ведання імі падручніка (яго структуры, зместу).

Слоўныя метады цесна звязаны з *наглядными*, роля якіх – служыць крыніцай атрымання ведаў і апорай для пазнавальнай дзейнасці вучняў. Асаблівае месца адводзіцца *метаду назірання і аналізу* моўных фактаў.

*Метад ілюстрацыі*, як правіла, звязаны з выкарыстаннем наглядных сродкаў рознага тыпу, а *метад ілюстрацыі* – з тэхнічнымі сродкамі. Яны атрымалі назву *метаду нагляднасці*.

Рэдка, але не менш эфектыўна выкарыстоўваецца *метад экскурсіі,* калі вучні ў пазаўрочных умовах аналізуюць тое, што іх найбольш уражвае.

Вялікую ролю адыгрываюць і практычныя метады – *практыкавання, метад самастойнай працы вучняў.*

У апошні час з актывізацыяй праблемнага навучання выдзяляюцца метады праблемнага навучання як сродкі яго рэалізацыі (3, с.35-36). Да метадаў *праблемнага навучання* адносяцца:

- *праблемны выклад ведаў*, калі настаўнік у ходзе паведамлення новага матэрыялу (у тым ліку і пра прыметнік) сістэматычна стварае праблемныя сітуацыі, ставіць пытанні і паказвае шляхі вырашэння вучэбных праблем, пастаянна пабуджае вучняў да самстойнай пазнавальнай дзейнасці;
- *выклад з праблемным пачаткам*, калі настаўнік у пачатку паведамлення новага матэрыялу стварае праблемную сітуацыю, а далей тлумачыць вучэбны матэрыял традыцыйным, інфармацыйным спосабам;
- *пошукавая гутарка*, ці часткова-пошукавы метад, калі шляхам лагічна ўзаемазвязаных пытанняў настаўніка і адказаў вучняў, ці пошукавай гутаркі, вырашаецца новая для вучняў праблема ці яе частка;
- *даследчы метад,* калі настаўнік арганізуе пошукавую, пазнавальную дзейнасць вучняў шляхам пастаноўкі пазнавальных і практычных задач, якія патрабуюць самастойнага творчага вырашэння.

М.Г.Яленскі (4,с.154-158) зазначае, што ў апошні час часта выкарыстоўваецца шматаспектны (комплексны) лінгвістычны аналіз, які прадугледжвае знаходжанне моўных адзінак, вызначэнне іх функцыі, будовы і значэння, аднясенне да пэўнага стылю ці тыпу тэксту. Тут жа можа быць выкарыстаны :

- *лінгвістычны эксперымент* (калі шляхам замены, падстаноўкі, рэканструкцыі слоў выпрабоўваецца найбольш мэтазгоднае і апраўданае ўжыванне прыметнікаў);
- *граматычнае мадэліраванне* (выкарыстоўваецца як спосаб абагульнення вывучанага матэрыялу ў выглядзе схем, мадэлей і інш.);
- *творчы метад* (пры якім вывучэнне розных тэм, у прыватнасці прыметніка, садзейнічае навучанню дзяцей вусным і пісьмовым выказванням).

Пад тэрмінам "прыём" варта разумець сродак рэалізацыі выбранага метаду, канкрэтны варыянт вучэбнай дзейнасці настаўніка і вучняў, якія рэалізуюць ідэі метаду на ўроку (3, с.36). Пры вывучэнні прыметніка могуць быць выкарыстаны *дыдактыка-метадычныя прыёмы* (як разнавіднасці дзеянняў настаўніка і вучняў, якія вядуць да асэнсавання і засваення матэрыялу): нагляднасці, алгарытмізацыі, лагічныя прыёмы – абагульненне, супастаўленне, параўнанне, сістэматызацыя, аналіз, сінтэз, замена і г.д. Вялікую ролю адыгрываюць і *прадметныя (спецыфічныя) метадычныя прыёмы*. Сярод іх – розныя віды аналізу прыметніка (фанетычны, марфемны, словаўтваральны, лексічны, арфаграфічны і асабліва марфалагічны).

Такім чынам, пры падрыхтоўцы да ўрока, дзе вывучаецца прыметнік, важна ўлічваць, што структура і выбар метаду і прыёмаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навучання залежыць ад зместу матэрыялу, дыдактычных мэт, функцый метадаў, падрыхтоўкі вучняў, іх узросту, індывідуальных асаблівасцей, узроўню падрыхтоўкі настаўніка, матэрыяльна-тэхнічнай базы школы і інш.

## 4. Этапы вывучэння прыметніка на ўроках беларускай мовы

З.Б.Варановіч [1, с.79] сцвярджае, што фарміраванне паняцця аб часцінах мовы (у тым ліку і аб прыметніку) звычайна мае наступныя этапы працы:

- падрыхтоўка да ўспрыняцця паняцця;
- вывучэнне асобных палажэнняў паняцця, высвятленне іх сувязей паміж сабой, пацвярджэнне вынікаў канкрэтным моўным матэрыялам;
- фармулёўка вываду – азначэнне часціны мовы;
- першапачатковае замацаванне набытых ведаў у працэсе выканання разнастайных практыкаванняў.

Першы этап – *падрыхтоўка да ўспрыняцця паняцця прыметніка* – можа праходзіць у форме ўступнага слова настаўніка або яго гутаркі з класам.

Наступны этап – *вывучэнне асобных палажэнняў паняцця* – ўяўляе сабой працу пад граматычнай класіфікацыяй. На думку В.А.Ляшчынскай і З.У.Шведавай [3, с.121], найбольшай увагі патрабуюць пытанні аб разрадах прыметнікаў, аб іх ролі і ўжыванні ў маўленні, аб адметнасці ўтварэння форм ступеняў параўнання ў беларускай і рускай мовах і іх ужыванні, а таксама пытанні правапісу слоў-прыметнікаў.

Выдзяленне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў вельмі важна для засваення, паколькі звязана з асаблівасцямі ўтварэння, напісання. Так, вылучэнне прыналежных прыметнікаў (іх асэнсаванне звычайна не выклікае цяжкасцей) мае асаблівае значэнне для правільнага іх ужывання ў вуснай і пісьмовай мовах: яны ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў *–аў/-яў/-еў/-ёў/-оў/-аў* ад назоўнікаў мужчынскага роду (*Сашаў, Колеў, Міхасёў* і інш.) і *–ін/-ын* ад назоўнікаў жаночага роду (*Ірынін, Машын*). Пры гэтымважна ўлічваць спецыфіку правапісу такіх прыметнікаў то з вялікай, то з малой літары.

Якасныя прыметнікі лягчэй выдзяляць па наяўнасці форм ступеняў параўнання (*вясёлы - весялейшы*), паколькі адносныя і прыналежныя, а таксама некаторыя якасныя прыметнікі не маюць ступеняў параўнання. Аднак тут трэба засяродзіць увагу, па-першае, на выпрацоўцы навыкаў утварэння, адрознення форм вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнанняі іх ужывання ў беларускай мове і адрознення ад адпаведных форм рускай (рус.*веселый – веселее*; бел. *вясёлы - весялейшы*); па-другое, патрэбна ўлічыць, што маўленне вучняў беднае прыметнікамі ацэначнага характару. Вось чаму ў працы з вучнямі настаўніку трэба ставіць і вырашаць наступныя задачы: 1) у сувязі з тым, што прыметнікі заўсёды выступаюць як словы, якія спалучаюцца з назоўнікамі ў родзе, ліку і склоне, важна дабіцца

арганічнай сувязі прыметнікаў з назоўнікамі ў маўленчай дзейнасці вучняў; 2) пашыраць і ўдасканальваць навыкі сінтаксічнага разбору сказаў і вызначэння сінтксічнай функцыі прыметнікаў – азначэння, выказніка; 3) запэўніць вучняў у тым, што прыметнік – самая колькасная пасля назоўніка катэгорыя слоў, якая ўжываецца ў розных відах літаратурнага маўлення, і выклікаць у вучняў патрэбу карыстацца імі.

Вывучэнне прыметніка варта звязаць з фразеалогіяй, уключаючы ў разгляд фразеалагізмы з назоўніка і прыметніка, напрыклад: *доўгая песня* ‘тое, што патрабуе парцяглага часу’ і інш.

*Этап працы над фармулёўкай азначэння паняцця* патрабуе выпрацоўкі навыкаў абагульняць характэрныя рысы і складаць лагічнае, звязнае выказванне, у якім адлюстравалася б уменне разумець – што з чаго вынікае. Напрыклад: прыметнік – часціна мовы, якая абазначае прымету ці прыналежнасць а адказвае на пытанні які? Чый? Гэта першая, асноўная частка азначэння.

Другая частка азначэння раскрывае адносіны супрацьпастаўлення ўнутры сістэмы прыметнікаў: падзел іх на якасныя, адносныя і прыналежныя і інш.

Трэцяя частка азначэння адлюстроўвае сінтксічную ролю прыметніка ў сказе.

М.Г.Яленскі [4, с.295-298] вылучае наступныя этапы засваення марфалагічных з’яў:

- *этап прэзентацыі новага для вучняў моўнага матэрыялу*. Асноўная мэта працы на гэтым этапе – дапамагчы вучням пазнаёміцца з неабходнымі тэарэтычнымі звесткамі, прыметамі новага паняцця, убачыць, як яно функцыяніруе ў маўленні. Фарміраванне асноўнага паняцця тут адбываецца з выкарыстаннем інфарматыўна-рэцэптыўнага метаду: настаўнік паведамляе вучням новую інфармацыю з апорай на табліцы і схемы. Азнаямленне з прыметнікам адбываецца па плане: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічныя ўласцівасці, роля ў тэксце;
- *этап назірання за фактамі мовы*. Назіранне за фактамі мовы грунтуецца на выкарыстанні такіх лагічных аперацый, як параўнанне, устанаўленне агульнага і рознага ў сумежных з’явах, вызначэнне з’явы па названай прымеце, класіфікацыя, дыферэнцыяцыя, сістэматызацыя;
- *этап імітацыі (пераймання)*. Мэта парцы на гэтым этапе – навучыць дзяцей самастойна падбіраць прыклады, у якіх выкарыстанне прыметнікаў было б стылістычна і нарматыўна апраўданым;
- *этап падстаноўкі і трансфармацыі*. Асноўная яго мэта – фарміраванне ў вучняў навыкаў пабудовы звязнага тэксту з мэтай нейтральнага або эмацыянальна-ацэначнага ўзнаўлення прыметнікаў у залежнасці ад мэты камунікацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- *этап ужывання марфалагічных сродкаў у творчых працах вучняў*. Яго мэта - навучыць дзяцей шырока выкарыстоўваць прыметнікі ў творчых сачыненнях і пераказах.

Такім чынам, веданне настаўнікам этапаў засваення матэрыялу па тэме “Прыметнік” будзе толькі садзейнічаць больш паспяховай выпрацоўцы ўменняў і навыкаў у выкарыстанні граматычных форм прыметнікаў у вусным і пісьмовым маўленні вучняў.

## Выкарыстаная літаратура


1. Барановіч, З.Б. Методыка выкладання беларускай мовы/ З.Б.Барановіч. – Мінск: Вышэйш.шк., 1995.
2. Лаўрэль, Я.М. Вывучэнне марфалогіі ў школе/ Я.М.Лаўрэль, Т.Р.Новікава, С.А.Язерская. – Мінск: Нар. асвета, 1991.
3. Ляшчынская, В.А. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэбны дапаможнік/ В.А.Ляшчынская, З.У.Шведава. – Мінск: РІВШ, 2007.
4. Яленскі, М.Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання ў сучаснай школе/ М.Г.Яленскі. – Мінск: НІА, 2002.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ